База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# ГАРАДСКІ АРХІТЭКТАР

Цёплым чэрвеньскім днём 1897 года ў Гомелі на рагу Магілёўскай і Аляксандраўскай вуліц (цяпер Кірава і Камсамольская) сабраўся народ. Былі тут і гомельскі гарадскі галава А. Б. Станевіч з членамі будаўнічай камісіі і поўны састаў галосных гарадской думы. Сабраліся людзі з выпадку значнага для горада: тут вялася закладка Гомельскай класічнай гімназіі, «ствараемай ўтрыманнем горада Гомеля, па чарцяжах грамадзянскага інжынера С. Д. Шабунеўскага», — як указвалася на бронзавай закладной дошцы, што знаходзіцца зараз у экспазіцыі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

Пабудаваная ўжо ў 1898 годзе гімназія ўяўляла сабой двухпавярховы каменны будынак у псеўдагрэчаскім стылі, П-падобнай формы ў плане. Вырашаныя прыгожа і ўрачыста фасады не пакідалі ўражання манатоннага паўтарэння аднолькавых па прапорцыях аконных праёмаў класных памяшканняў, таму што сцены чляніліся выступамі ў выглядзе порцікаў з калонамі з дарычаскага і карынфскага ордэра пад трохвугольнымі франтонамі, дзяліліся гарызантальнымі прафіліраванымі карнізамі, багата дэкарыраваліся ляпнымі арнаментамі на фрызах, разетках, налічніках. Буйныя, больш высокія памяшканні (гімназічная царква, актавая і гімнастычная залы, зала для малявання) выступалі над агульным аб'ёмам уверх і наперад і асвятляліся вялікімі арачнымі вокнамі. Над гімназічнай Аляксандраўскай царквой узвышаўся купал з залачонай цыбуляй і крыжам.

У некалькі змененым выглядзе ў пасляваенны перыяд будынак былой мужчынскай гімназіі — адзін з карпусоў БІІЧТа.

Аўтар праекта гэтага велічнага збудавання 26-гадовы выпускнік Пецярбургскага інстытута грамадзянскіх архітэктараў Станіслаў Данілавіч Шабунеўскі.

Будучы родам з Адэсы, Станіслаў Данілавіч пасяліўся ў Гомелі. Тут ён звязаў свой лес з Ксеніяй Аляксандраўнай Мельнікавай, дачкой упраўляючага маёнткам Паскевічаў. Гэта менавіта яму, правадзейнаму стацкаму саветніку Аляксандру Пятровічу Мельнікаву да 50-гадовага юбілею князь падарыў луг на правым беразе ракі Сож паблізу Валатавы, які атрымаў назву Мельнікаў. У савецкі час луг быў перайменаваны ў Пралетарскі, актыўнымі будаўнічымі работамі часткова зменена яго аблічча, але ў памяці гамяльчан ён застаўся як Мельнікаў луг — любімае месца летняга адпачынку.

Жылі Мельнікавы на Румянцаўскай (цяпер Савецкай) вуліцы, паводле сцвярджэння Міры Ільінічны Фрыдман, якая сябравала з дачкой Шабунеўскага Аленай, у двухпавярховым цагельным доме, які па сучаснай нумарацыі адрасуецца як Савецкая, № 50. Відавочна, нейкі час у доме ў Мельнікавых жыў і Шабунеўскі з сям'ёй. Пазней па яго праекту быў пабудаваны арыгінальны будынак каля гарадскога сквера на Румянцаўскай (не захаваўся, быў прыкладна на тым месцы, дзе цяпер цырк).

Пражыўшы ў Гомелі з 1897 па 1937 год і прадуючы гарадскім, а пасля рэвалюцыі губернскім архітэктарам, Станіслаў Данілавіч Шабунеўскі пакінуў аб сабе цудоўную памяць: па яго праектах у горадзе былі пабудаваны многія жылыя і грамадскія будынкі. Далёка не ўсе яны захаваліся да нашых дзён, але і тое, што засталося, дае магчымасць убачыць талент гэтага архітэктара, які валодаў цудоўным мастацкім густам, умеў будаваць дамы з улікам іх прызначэння.

Неакласічныя матывы выкарыстаны Шабунеўскім у будаўніцтве манументальных, выдзяляўшыхся на фоне іншых дамоў сваёй значнасцю, банкаўскіх пабудоў. У 1901 годзе ім быў пабудаваны будынак і Арлоўскага

камерцыйнага банка на рагу Румянцаўскай і Ірынінскай вуліц (пасля вайны да яго дабудаваны трэці паверх і зараз гэта адміністрацыйны будынак на рагу Савецкай і Перша майскай вуліц). Будынак Віленскага камерцыйнага банка пабудаваны архітэктарам у 1910-12 гадах на рагу Румянцаўскай і Троіцкай вулід (зараз адміністрацыйны будынак на рагу Савецкай і Сялянскай).

Значна больш ярка матывы мадэрна адлюстроўваліся ў пабудаваных С. Д. Шабунеўскім жылых дамах. Суадносіны прамых і круглых ліній, арачнае афармленне дзвярных і аконных праёмаў, балконаў, выкананая з мастацкім густам лепка — усё гэта стварала ўтульнасць чалавечаму жыллю. У жанры асабняка з дэкорам мадэрна ў 1903 годзе быў пабудаваны дом для вядомага гомельскага ўрача Навума Ільіча Аляксандрава на вуліцы Ірынінскай (зараз Дом грамадзянскіх абрадаў на вуліцы Першамайскай). Яўныя матывы мадэрна ў двухпавярховым жылым доме на рагу вуліц Баярскай і Мільённай (1909 год, зараз таксама жылы дом на рагу вуліц Баўмана і Білецкага). Спакойны дэкор і ўтульныя прасторныя памяшканні для хворых былі ў пабудаваных Станіславам Данілавічам пры фінансавым удзеле княгіні Ірыны Іванаўны Паскевіч у перыяд імперыялістычнай вайны будынкаў ваеннага шпіталю і гарадской бальніцы на вуліцы Князя Паскевіча (1914, зараз ваенны шпіталь і корпус бальніцы хуткай дапамогі на вуліцы Камісарава).

Яшчэ ў дарэвалюцыйны перыяд у пабудовах Шабунеўскага пачалі з'яўляцца элементы канструктывізму. Тэтаназіраецца ўжо ў вонкавым абліччы камфартабельнай гасцініцы «Савой», пабудаванай у 1912 годзе на рагу вуліц Румянцаўскай і Мясніцкай. На жаль, гэты будынак захаваўся толькі на фатаграфіі, на яго месцы зараз «Дом гандлю» (рог вуліц Савецкай і Камунараў).

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Станіслаў Данілавіч па-ранейшаму працуе архітэктарам. У 1920-я гады ён кіруе аднаўленчымі работамі ў былым палацы Паскевічаў. На праспекце Леніна захаваўся корпус пабудаванага ім хлебазавода. У гэты час ён праектаваў забудову так званага «гарэлага балота», будаваў жылыя дамы, улічваючы тэндэнцыю таго часу жыць разам. У 1927 годзе на вуліцы Пушкіна (№ 26) ім быў пабудаваны адзін з першых у Гомелі шматпавярховы жылы дом секцыйнага тыпу, які меў рысы канструктывізму. Самым высокім будынкам даваеннага горада быў шасціпавярховы дом для рабочых паравозавагонабудаўнічага завода з кватэрамі камунальнага тыпу — Дом-камуна (1929-31 гады), Пазней будаваліся дамы з асобнымі кватэрамі добраўпарадкаванага тыпу. Удалым узорам грамадзянскай архітэктуры перадваеннага перыяду з'яўляецца жылы дом на праспекце Леніна, 31 (у цокальным паверсе магазін «Рыба»). Ен складаецца з цэнтральнага аб'ёму і бакавых крылляў, якія ўтвараюць утульны ўнутраны дворык.

У 1934 годзе па неабгрунтаванаму абвінавачванню Станіслава Данілавіча арыштавалі, ён адбываў вольнае пасяленне ў Мінску. У другі раз Шабунеўскі быў арыштаваны ў 1937 годзе і адпраўлены на Мядзведжую гару сумна вядомага ў гэты перыяд Беламорканала. Адтуль ён ужо не вярнуўся.

Добрае імя Станіславу Данілавічу Шабунеўскаму было вернута толькі ў наш час: у 1980-я гады ён быў рэабілітаваны.

Неабходна вярнуць і памяць пра гэтага таленавітага архітэктара, які ўнёс вялікі ўклад у горадабудаўніцтва Гомеля і пакінуў на яго вуліцах цудоўныя помнікі архітэктуры. Было б справядлівым устанавіць памятныя дошкі з указаннем імя аўтара праектаў

на адзінаццаці захаваўшыхся з пабудаваных С. Д. Шабунеўскім будынках. А вуліцу, якая вяла ад мужчынскай Аляксандраўскай гімназіі да Румянцаўскай і названую ў гонар гэтага Аляксандраўскай (зараз вуліца Камсамольская), перайменаваць у вуліцу (або, што было б больш дакладна, бульвар) архітэктара С. Д. Шабунеўскага.

Хочам таксама звярнуцца да старажылаў нашага горада, якія маюць якія-небудзь звесткі аб жыцці і творчасці С. Д. Шабунеўскага, паведамляць іх у абласны краязнаўчы музей.

**Т. ЛІТВІНАВА, загадчыца мастацкага сектара абласнога краязнаўчага музея.**

Літвінава, Т. Гарадскі архітэктар: [Станіслаў Шабунеўскі] / Т. Літвінава // Гомельская праўда. – 1990. – 5 чэрвеня.